УДК 821.161.3

**П. Р. Кошман**
Кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай і рускай філалогіі,
УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь

# НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ЯК ПРАДМЕТ БЕЛАРУСКАГА ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАГА ДЫСКУРСУ: ТРАДЫЦЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

*У артыкуле разглядаецца катэгорыя нацыянальнага як найважнейшы прадмет айчыннага літаратуразнаўчага дыскурсу, вызначаюцца тэндэнцыі яго навуковай рэцэпцыі і іх залежнасць ад гісторыка-культуралагічных абставін, даецца характарыстыка сучасным даследчыцкім пошукам у сферы спасціжэння нацыянальнага вобраза свету.*

*Ключавыя словы: беларуская літаратура, нацыянальная самабытнасць, беларускае літаратуразнаўства, ментальность, нацыянальны вобраз свету.*

## Уводзіны

У беларускім гістарычным кантэксце мастацтва слова і нацыянальная супольнасць цесна з'яднаны паміж сабой, іх развіццё часта характарызуецца аднымі і тымі ж падзеямі, постацямі, дасягненнямі і праблемамі. Таму сучаснае спасціжэнне беларускай культуры грунтуецца на ўяўленні аб значнасці ролі мастацтва слова ў працэсах фарміравання яе самабытнага нацыянальнага вобліку. Так, падкрэсліваючы асаблівы статус мастацкай літаратуры ў быцці беларускай супольнасці, М. Тычына вылучае ў якасці найважнейшай рысы нацыянальнай культуры яе "традыцыйны літаратурацэнтрызм" [1, 45] і ўказвае на сувязь айчыннай літаратуры з беларусазнаўствам [1, 46]. Сінкрэтычнае разуменне сфер літаратурнага развіцця і нацыянальнага будаўніцтва вызначае спецыфіку беларускага літаратуразнаўчага дыскурсу і характарызуе найбольш важныя этапы яго развіцця.

## Вынікі даследавання і іх абмеркаванне

Ад часу ўзнікнення новай беларускай літаратуры прыярытэт у мастацкім пазнанні рэчаіснасці быў аддадзены яе аўтарамі беларускаму люду. Разуменне важнасці сувязі айчыннага мастацтва слова і жыцця народа выявілася ў той ацэнцы, якая давалася творам пісьменнікаў-пачынальнікаў на прадмет адлюстравання ў іх змесце асаблівасцей беларускай культуры. Развіваючыся пад уплывам эстэтыкі рамантызму, ідэйна-эстэтычная думка XIX ст. – пачатку XX ст. станоўча разглядала прааявы пісьменніцкай увагі да мясцовага фальклору, лічыла паэтычны зварот да яго тэм і вобразаў дастатковай падставай для вызначэння твора як беларускага. Сувязь з творчасцю народа і яго жыццём з'явілася для тагачаснага айчыннага мастацтва слова своеасаблівым крытэрыем яго беларускасці, прысутнасць якога па меры развіцця літаратуры ўзмацнялася. Так, Я. Баршчэўскі абгрунтоўваў выбар мастацкай формы з мясцовага фальклору тым, што "чужаземнае не будзе пасаваць негаваркому жыхару Беларусі" [2, 4]; Ф. Багушэвіч ужо ставіў пытанне аб з'яўленні кнігі "аб жыцці нашым, каб па-нашаму" [3, 21], а М. Багдановіч, звяртаючы увагу на сувязь літаратуры і менталітэту, пераконваў: "Як кожны народ мае сваю нацыянальную душу, так ён мае і свой асаблівы склад (стыль) творчасці, найбольш прыдатны да гэтай душы" [4, 288].

Адметную трактоўку пытанне ўвасаблення нацыянальнага кампанента ў літаратуры набыло за савецкім часам. Уласцівасць мастацкага слова трансліраваць праз творчае светабачанне пісьменніка не толькі індывідуальнае, але і калектыўнае была своеасабліва ўспрынята савецкай уладай. У яе дзяржаўнай палітыцы літаратура разглядалася найперш як важны інструмент уплыву на калектыўную свядомасць, эфектыўны сродак яе фарміравання. Пры гэтым ідэя развіцця менавіта нацыянальнага пачуцця супольнасці ў першачарговыя планы пабудовы сацыялістычнага грамадства, за выключэннем кароткага перыяду беларусізацыі ў 20-ыя гады, не ўваходзіла і, уласна кажучы, не заахвочвалася да папулярызацыі ў мастацкім слове. У грамадскай думцы краіны паступова фарміравалася ідэалагема новай этнічнай адзінкі – савецкага народа як адметнай

© Кошман П. Р., 2017

МГПУ им. И. П. Шамякина

шматмоўнай людской супольнасці. Таму ў афіцыйнай канцэпцыі савецкай літаратуры, якая грунтавалася на тэзісе аб "рознастайнай па нацыянальнай форме і адзінай па свайму сацыялістычнаму зместу" [5, 3], нацыянальнае разглядалася толькі як сродак, але не мэта творчасці. Ідэалагічныя нарматывы літаратуры дапускалі прысутнасць адзнак нацыянальнага ў мове мастацкага твора або ў выяўленні мясцовага каларыту, але да ўвасаблення яго ў якасці асновы светапогляднай аўтарскай пазіцыі ставіліся дастаткова крытычна.

Катэгорыі нацыянальнага, прадстаўленыя ў літаратуры дастаткова незалежнымі ад сацыяльнага статусу каштоўнаснымі вобразамі-канцэптамі радзімы, спадчыны, мовы, прыроды і скіраваныя на сцвярджэнне ідэі адзінства народа, цяжка суадносіліся з прынцыпам класавасці сацыялістычнага мастацтва. Аднак адмаўленне ад нацыянальнай светапогляднай асновы не магло быць прымальным для беларускага літаратурнага асяроддзя, паколькі азначала страту ім унікальнасці, згоду на поўную ўніфікацыю. Генетычна залежная ад нацыянальнага канону і разам з тым кіраваная ідэалагічнымі пастулатамі айчынная літаратурная традыцыя савецкага часу была вымушана ісці шляхам пераадолення супярэчнасцей і пошуку кампрамісу. Ажыццяўленне гэтага своеасаблівага эксперыменту па сінтэзе нацыянальнага і сацыялістычнага шмат у чым абумовіла развіццё беларускай літаратуры і літаратуразнаўства ў савецкі перыяд. На фоне ідэалогіі барацьбы вельмі пазітыўным выглядае той кірунак развіцця беларускай літаратуры ў новых умовах, які быў прапанаваны А. Бабарэкам. Распрацаваную ім канцэпцыю пераемнасці так званых літаратурных плыняў "адраджанізму" і "маладнякізму" можна лічыць своеасаблівай спробай прадухіліць негатыўныя наступствы падзелу нацыянальнага творчага асяроддзя па класавай прыкмеце. У артыкуле "Вясну радзіла восень" даследчык указваў на плённасць паслядоўнага развіцця літаратурнай традыцыі, звязаў важнасць зробленага пісьменнікамі ў "нашаніўскі" перыяд з імкненнем "паставіць на роўны ўзровень з іншымі народамі беларускае мастацтва слова" [6, 91]. Талент пісьменніка духоўна ўзбагачае ўсю нацыянальную супольнасць незалежна ад сацыяльнага статусу яго прадстаўнікоў. Па словах А. Бабарэкі: "Поэта свой вопыт душэўны цераз мастацтва робіць годнасьцю нацыі, а цераз яе і ўсяго чалавецтва" [6, 110]. Відавочна, што найважнейшай задачай нацыянальнага мастацтва слова і адначасова галоўным крытэрыем ацэнкі літаратуразнаўствам узроўню яго развіцця павінна быць маштабнасць, глыбіня і аб'ектыўнасць спасціжэння пісьменнікам таго свету, часткай якога з'яўляецца ён сам.

Пасля рэпрэсій 30-х гадоў асэнсаванне праблемы спалучэння нацыянальнага і класавага на матэрыяле біяграфій пісьменнікаў страціла вастрыню, але захавалася ў дачыненні да мастацкай творчасці. У савецкі час літаратурная спадчына разглядалася пераважна праз прызму сацыяльнага супрацьстаяння: пісьменнікі, схільныя да класавай салідарнасці на аснове этнічнага адзінства, крытыкаваліся за ўтапічнасць, а пытанне аб магчымай прыналежнасці прадстаўнікоў розных сацыяльных слаёў да адзінай супольнасці ігнаравалася. У даследаваннях дамінавала практыка прыпадабнення вобразаў селяніна і беларуса, найважнейшыя рысы якіх прызнаваліся раўназначнымі. Такі падыход звычайна абмяжоўваўся пошукам нацыянальнага праз вылучэнне шэрагу станоўчых адзнак у вобразах людзей з народа і пакідаў па-за ўвагай беларускую сутнасць адмоўных персанажаў. Так, пры даследаванні "Палескіх аповесцей" Якуба Коласа нацыянальны характар беларуса ўвасаблялі палешукі, сяляне-аднавяскоўцы Лабановіча, урэшце, сам галоўны герой, але не было спроб убачыць агульнабеларускія рысы ў такім каларытным, але адмоўным персанажы, які прадстаўляе настаўнік Саханюк. Дарэчы, і ў сучасных даследаваннях таксама часта сустракаецца абмежаванне паняцця нацыянальнага характару толькі комплексам пазітыўных адзнак, абумоўленае ўласцівасцю людской свядомасці надзяляць прадстаўнікоў сваёй супольнасці станоўчымі характарыстыкамі.

Адным з важнейшых кірункаў айчыннага літаратуразнаўства, пачынаючы з 60-х гадоў, стаў аналіз літаратурнай спадчыны Беларусі на прадмет мастацкага адлюстравання ў ёй асаблівасцей нацыянальнага ўспрымання свету. Яшчэ А. Бабарэка, шукаючы крытэрыі вызначэння ўзроўню развіцця беларускай літаратуры, задаваўся пытаннем "Ці ёсць яна формаю об'ектывізацыі эмоцыянальнага пазнаньня сьвету, здабытага вопытам беларускай душы?" [6, 110]. Гэтая іманентная задача літаратуры ствараць мастацкую мадэль нацыянальнага быцця аказалася асабліва запатрабаванай, калі беларускае мастацтва слова, дзякуючы творам І. Мележа, Я. Брыля, В. Быкава і іншых аўтараў, стала знаходзіць прызнанне за межамі Беларусі. Разумеючы важнасць далейшых крокаў у гэтым напрамку, А. Адамовіч пачаў размову пра важнейшую мэту беларускай літаратуры, "пра такое асэнсаванне свету, якое ўвабрала б у сябе галоўныя "параметры" народнага, нацыянальнага жыцця ў кантэксце ўсяго чалавецтва. І пра такое эстэтычнае, мастацкае рашэнне,

МГПУ им. И.П.Шамякина

якое ўвесь неабдымны матэрыял гісторыі і сучаснасці сканцэнтравала б у адным творы, у адным ці некалькіх вобразах" [7, 611].

Разам з поглядам у будучае беларускага мастацтва слова ў 70–80-ыя гады яго даследчыкамі была ўзнята праблема вызначэння нацыянальнага зместу ў дачыненні да літаратурнай спадчыны Беларусі. Вяртанне ў кантэкст гісторыі беларускай літаратуры вялікага комплексу іншамоўных мастацкіх твораў, здзейсненае А. Мальдзісам, Г. Кісялёвым, У. Мархелем і іншымі даследчыкамі, міжволі выклікала пытанне аб яго нацыянальнай прыналежнасці. Неабходнасць абгрунтавання таго тэзісу, што мова – гэта найважнейшы, але не адзіны крытэрый вызначэння нацыянальнага ў творы, скіравала даследаванні на спасціжэнне літаратуры як з'явы, у аснове якой знаходзіцца нацыянальны менталітэт. Аналіз вобразнага зместу мастацкіх твораў, пошуку ў ім адзнак індывідуальнага і калектыўнага светапогляду, выяўленне іх суадносін дазволіў паказаць важнасць на матэрыяле айчыннай літаратуры таго, што звязвае асобу пісьменніка з культурным досведам яго краіны і праяўляецца ў агульных ідэйна-эстэтычных падыходах да ўспрымання акаляючага свету.

У літаратуразнаўчых даследаваннях савецкага часу заўважаецца наступная дэталь: іх аўтары, гаворачы пра "нацыянальны характар", "нацыянальную літаратуру", "нацыянальнае вызваленне", "нацыянальны прыгнёт", надзвычай часта аперыравалі словазлучэннем "беларускі народ" і вельмі рэдка звярталіся да выразу "беларуская нацыя". У дадзеным выпадку паняцце "народ" прадстаўляла тую ідэалізаваную канструкцыю людской большасці, якая ад часоў рамантызму бачылася эталонам маральнай чысціні і культурнага багацця. У сваю чаргу тэрмін "нацыя", абазначаючы высокую ступень кансалідацыі, разуменне свайго адзінства, шырока ўвайшоў ва ўжытак айчыннага літаратуразнаўства на хвалі перамен у грамадстве канца 80-х – пачатку 90-х гадоў XX ст. У гэты час праблематыка нацыянальнага аказалася цесна звязанай з даследаваннем самасвядомасці і менталітэту беларусаў.

На мяжы XX–XXI стст. літаратуразнаўчы слоўнік дапоўніўся такімі фармуліроўкамі, як "нацыянальная ідэнтычнасць", "нацыянальны хранатоп", "нацыянальная карціна свету", "нацыянальны вобраз свету", "нацыянальны міф". Істотнай асаблівасцю даследаванняў гэтага часу з'яўляецца тое, што ўвага канцэнтруецца на прадстаўленні нацыянальнага як элемента творчага мыслення. Адзначаная змена навуковых акцэнтаў адбылася не без уплыву на літаратуразнаўства постмадэрнісцкага разумення нацыі як супольнасці "ўяўленай" (Б. Андэрсан), г.зн. створанай яе прадстаўнікамі з дапамогай культурных дыскурсаў. Дадзеная канцэпцыя паходжання нацыі, бачачы ў літаратурнай традыцыі эфектыўны сродак фарміравання сярод людскіх мас уяўленняў аб сабе як адзіным нацыянальным цэлым, фактычна прызнала мастацтва слова найважнейшай сферай рэпрэзентацыі нацыянальнага светапогляду. Адпаведна гэтаму статусу вырасла разуменне глыбіні ўвасаблення ў мастацкім творы нацыянальнага, выяўленне якога не абмяжоўваецца толькі аналізам паасобных дэталей мастацкай рэчаіснасці (мова, быт, пейзаж, менталітэт і іншыя), а перарастае на сённяшнім этапе ў даследаванне ўсёй той складанай канструкцыі, якой з'яўляецца мастацкі свет твора.

Погляд на твор як складаную мастацкую рэканструкцыю свету, змест і будова якой адлюстроўвае сувязь аўтара з калектыўным светапоглядным досведам, акцэнт даследчыцкай увагі на літаратуру як сферу выяўлення вобразаў нацыянальнага свядомага і бессвядомага запатрабаваў фарміравання ў літаратуразнаўчай практыцы адпаведнага навуковага паняцця. На постсавецкай прасторы з гэтай мэтай устойліва ўжываецца вызначэнне "нацыянальны вобраз свету". Упершыню яно было ўведзенае ў 80-ых гадах XX ст. вучоным-культуролагам Г. Гачавым і тлумачылася ім як адбітак у пэўнай культурнай традыцыі так званага "*Космо-Психо-Логосу*" [8, 16] – адзінства прыроды, характару народа і складу яго мыслення. Разважанні расійскага даследчыка грунтаваліся на аналізе розных сфер культуры (мова, кіно, архітэктура, выяўленчае мастацтва), аднак найчасцей фактычным матэрыялам яго даследаванняў з'яўлялася класічная літаратурная спадчына. Прапанаванае Г. Гачавым паняцце "нацыянальны вобраз свету" вельмі ўдала сумясціла ўказанне на аб'ект (нацыянальнае) і прадмет (вобраз) даследавання, але ўсё ж засталося без дакладнай дэфініцыі. Распрацоўка зместу дадзенага паняцця працягваецца і па сённяшні дзень, і вельмі важнымі ўяўляюцца працы тых даследчыкаў, якія акцэнтуюць увагу на ўзаемазвязанасці праяў нацыянальнага ў тэксце. Так, С. Шашунова ў артыкуле "Национальный образ мира как категория этнопоэтики русской словесности" вызначае прадмет свайго даследавання "как многоуровневую художественную структуру – комплекс взаимодействующих компонентов литературного текста, обладающих этнокультурной спецификой…" і ўдакладняе, што "компоненты, образующие в своей совокупности национальный образ мира, выявляются в образном строе, сюжетно-композиционной и пространственно-временной организации текста" [9]. У цэлым паняцце "нацыянальны вобраз свету"

МГПУ им. И.П.Шамякина

запатрабавана сучаснымі расійскімі даследчыкамі (Э. Шафранская, Т. Смыкоўская, Н. Авакумава і інш.) найперш для даследавання тыпалогіі мастацкага светаўспрымання народаў Расіі. Адзначым, што ў сучасным літаратуразнаўстве актыўна выкарыстоўваюцца таксама вызначэнні "нацыянальная карціна свету" (М. Папова), "нацыянальны міф" (Л. Хабібуліна), якія ў цэлым суадносяцца з паняццем "нацыянальны вобраз свету".

У беларускім літаратуразнаўстве разуменне нацыянальнага як асновы мастацкага адлюстравання рэчаіснасці ў значнай ступені фарміравалася ў працэсе ўнутранага развіцця. І хаця само паняцце "нацыянальны вобраз свету" ўвайшло ва ўжытак айчынных даследчыкаў непасрэдна пасля прац Г. Гачава, аснова для выкарыстання гэтага тэрміна была падрыхтавана беларускім літаратуразнаўствам дастаткова самастойна. Ва ўсякім выпадку яго сучаснае выкарыстанне стала працягам традыцыйных даследчыцкіх практык, скіраваных на аналіз спецыфікі мастацкага спасціжэння духоўнага і матэрыяльнага быцця беларускага народа. Так, А. Бельскі ў артыкуле "Свет пачынаецца з малога… (Малая радзіма і нацыянальная карціна свету)", аналізуючы рэгіянальныя пейзажныя малюнкі ў вершах Я. Коласа, М. Танка, Р. Барадуліна, Я. Янішчыц, звязвае спасціжэнне агульнага паэтычнага вобліку беларускага ландшафту менавіта з раскрыццём нацыянальнага вобраза свету. Прадстаўляючы сутнасць прадмета даследавання так, што "гэта беларуская светабудова, склад і адметнасць прасторавага мыслення народа" [9, 9], даследчык вельмі цесна спалучае яго з такімі катэгорыямі, як нацыянальны свет, вобраз радзімы. Падобная ўзаемазамяняльнасць паняццяў сустракаецца і ў іншых даследчыкаў. Артыкулы С. Андраюка ("Нацыянальны вобраз свету і чалавека"), Т. Барысюк "Нацыянальны вобраз свету і чалавека ў паэзіі Леаніда Дранько-Майсюка, Віктара Шніпа, Эдуарда Акуліна і Людмілы Рублеўскай"), З. Мельнікавай ("Нацыянальны вобраз свету і філасофскі ўніверсалізм паэзіі Міхася Рудкоўскага") раскрываюць акцэнтаваны ў назве прадмет даследавання праз спасціжэнне феномена сувязі творчай асобы з вобразамі роднага краю.

На сучасным этапе беларускае літаратуразнаўства пачало ўспрымаць катэгорыю нацыянальнага вобраза свету як данасць, з дапамогай якой прынята абазначаць прыналежнасць да нацыянальнага і якая не мае патрэбы ў дадатковых тлумачэннях. Аднак навука, у тым ліку і літаратуразнаўчая, патрабуе дакладнасці, зыходзячы з якой нельга прызнаць раўназначнымі паняцці "нацыянальны вобраз свету" і "вобраз нацыянальнага свету". Нягледзячы на сэнсавую блізкасць, першае з іх больш маштабнае і ўключае ў свой аб'ём як прасторава-часавыя каардынаты быцця беларусаў (вобраз радзімы), так і тыпалогію беларускага светабачання наогул. На ёмістасць і складанасць структуры катэгорыі нацыянальнага вобраза свету звяртае ўвагу Я. Гарадніцкі. Па яго словах: "Адметнасць светабачання кожнага народа, выяўляемая ў мностве характэрных прыкмет яго паўсядзённай дзейнасці, абагульнена прадстае ў цэласным вобразе свету, у якім сканцэнтроўваюцца шматвяковы гістарычны вопыт, практычныя, духоўныя і эстэтычныя веды. Нацыянальны вобраз свету, такім чынам, з'яўляецца архетыповым увасабленнем самых розных бакоў рэчаіснасці, інварыянтам, які ва ўсіх канкрэтных выпадках уяўляе сабой сумяшчэнне агульнага і асаблівага" [11, 57].

Мастацкі вобраз свету як зроблены аўтарам адбітак рэчаіснасці заўсёды нясе ў сабе адзнакі суб'ектыўнасці. Яны вынікаюць з абставін жыцця пісьменніка, яго творчых схільнасцей, сацыяльнага паходжання, палітычных поглядаў, складу мыслення – усяго таго, што вызначае яго асобу. Разам з тым пісьменнік, як кожны чалавек, з'яўляецца ўвасабленнем свайго часу, сваёй зямлі, народа, а таму адлюстроўвае праз уласны вобраз свету ў тым ліку і тыя рысы светапогляду, якія ўласцівы яго супольнасці ў цэлым. Гэтае ментальнае адзінства ў поглядах на акаляючую рэчаіснасць найлепш выяўляе сябе ў літаратурнай традыцыі праз асаблівую цікавасць пісьменнікаў розных генерацый да адных і тых жа рэалій быцця народа, праз устойлівасць дадзеных ідэйна-эстэтычных ацэнак. Таму, на наш погляд, найбольш эфектыўным прыёмам літаратуразнаўчага даследавання нацыянальнага на сучасным этапе з'яўляецца вылучэнне ў існуючым мностве індывідуальных мастацкіх варыянтаў асэнсавання рэчаіснасці тых канцэптаў, якія сведчаць аб светапоглядным адзінстве аўтараў як прадстаўнікоў адной нацыянальнай супольнасці.

**Вывады**

Такім чынам, у айчыннай літаратуразнаўчай традыцыі рэцэпцыя нацыянальнага характарызуецца паступовым развіццём яе праблемнага поля ад выяўлення сувязі з фальклорам да вывучэння калектыўных уяўленняў і з'яўляецца ў сучасны момант тым даследчыцкім кірункам, які дазваляе спасцігнуць з дапамогай параўнальнага аналізу асаблівасці беларускага ўспрымання свету.

МГПУ им. И.П. Шамякина

СПІС АСНОЎНЫХ КРЫНІЦ

1. Тычына, М. А. Філасофія літаратуры: беларускі варыянт / М. А. Тычына. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 324 с.

2. Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь ў фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі; прадм. і камент. М. Хаўстовіча. – Мінск : Маст. літ., 2009. – 326 с.

3. Багушэвіч, Ф. Творы / Ф. Багушэвіч; уклад. і прадм. Я. Янушкевіча; камент. У. Содаля, Я.Янушкевіча. – 2-е выд. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 206 с.

4. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск : Беларуская навука, 2001. – Т. 2 : Мастацкая проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – 2-е выд. – 600 с.

5. Барысенка, В. Фрацішак Багушэвіч і праблема рэалізму ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя / В. Барысенка. – Мінск : АН БССР, 1957. – 364 с.

6. Бабарэка, А. Збор твораў : у двух тамах / А. Бабарэка. – Вільня : Інстытут беларусістыкі, 2011. – Том 1 : Літаратурна-крытычныя працы. – 939 с.

7. Адамовіч, А. Здалёк і зблізку : зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў / А. Адамовіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1976. – 622 с.

8. Гачев, Г. Ментальности народов мира / Г. Гачев. – Москва : Алгоритм, 2008. – 544 с.

9. Шешунова, С. В. Национальный образ мира как категория этнопоэтики русской словесности / С. В. Шешунова. – Режим доступа : http://philolog.petrsu.ru/journal/konf/ 2008/01-sheshunova.htm. – Дата доступа : 26.05.2016.

10. Бельскі, А. Свет пачынаецца з малога… (Малая радзіма і нацыянальная карціна свету) / А. Бельскі // Беларуская літаратура ХХ стагоддзя: гісторыя і сучаснасць: у дапамогу настаўнікам і студэнтам. – Мінск : Аверсэв, 2005. – С. 9–19.

11. Гараднiцкі, Я. Паэтыка беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: суб’ектыўна-аб'ектыўныя адносіны / Я. Гараднiцкі. – Мінск : Беларуская навука, 2010. – 322 с.

*Паступіў у рэдакцыю 17.03.17*

E-mail: pauloko7h@gmail.com

P. R. Koshman

NATIONAL FEATURES AS A SUBJECT OF THE BELARUSIAN LITERATURE DISCOURSE: TRADITION AND MODERNITY

The categoty of the national feature is treated as the most significant issue of the homeland literary discourse in this article. Tendencies of its scientific reception and their dependence from historical and cultural circumstances are described. Modern research in the field of the national image of the world is given.

Keywords: belarusian literature, national identity, Belarusian Literary study, mentality, national word image.

МГПУ им. И.П.Шамякина